**Газета дзяржаўнай установы адукацыі “Грычынскі вучэбна-педагагічныкомплекс яслі-сад –базавая школа”**



# Перапынак!



Школа - гэта родны дом,
Дружна тут усе жывём,
Пра падзеі ў школьным свеце
Мы раскажам у газеце!

№5
Студзень, 2022

## Чытайце ў нумары:

*Аздараўленчы лагер "Снегавічок" стар. 2*

*Канікулы з інтарэсам і карысцю стар. 3*

*Здаровае харчаванне-здаровае дзіця стар. 4*

*Акцыя 'Птушкі на кармушцы" стар.5*

*Весткі з дзіцячага сада стар. 6*

# Аздараўленчы лагер “Снегавічок”

У чарговы раз школьны аздараўденчы лагер “Снегавічок” гасцінна расчыніў свае дзверы перад усімі жадаючымі. Дзеці з задавальненнем удзельнічалі ў прапанаваных мерапрыемствах: спартыўных, творчых, інтэлектуальных. Яны даведаліся шмат новага і цікавага, навучыліся вырабляць розныя падарункі, а самае галоўнае захавалі і ўмацавалі сваё здароўе














# Канікулы з інтарэсам і карысцю

Канікулы - цудоўны час, якога так чакаюць дзеці. Гэта слаўныя дзянькі, калі няма вучобы і, адсутнічае вострая неабходнасць рана прачынацца. Але гэта час наведаць новыя мясціны, даведацца нешта новае і паспрабаваць свае сілы ў розных занятках.












# Здаровае харчаванне – здаровае дзіця

З 17 па 22 студзеня ў нашай установе праходзіў тыдзень пад дэвізам “Здаровае харчаванне – здаровае дзіця”.  З самага дзяцінства дзеці павінны навучыцца з усёй разнастайнасці прадуктаў выбіраць тыя, якія на самай справе карысныя для здароўя. Таму ў кожным класе прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя правільнаму і рацыянальнаму харчаванню.













# Акцыя "Птушкі на кармушцы"

*Снегіры, сінічкі,*
*Сыплю вам пшанічкі,*
*Крупак, крошак хлеба!*
*Вам жа мала трэба!*

Зіма для птушак - самая цяжкая пара. Каб дапамагчы ім перазімаваць, неабходна пастаянна падкармліваць іх на працягу ўсяго марознага перыяду. Навучэнцы нашай установы сумесна з педагогамі і бацькамі зрабілі кармушкі і рэгулярна папаўняюць іх.











# Весткі з дзіцячага сада

Студзень у нас быў таксама не сумным. Мы удзельнічалі ў раённым чэленджы "Зімовыя забавы". Ляпілі са снегу казку "Калабок". Удзельнічалі ў абласным педагагічным праекце "Пісьмо сябру". І проста весела гулялі ў зімовыя гульні.









